Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка

# Праграма

## па гісторыі славянскіх народаў

Мінск 1998

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 940 (075.8)
ББК 63.3 (4)я73
П 784

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

Зацверджана на пасяджэнні Вучонага савета гістарычнага факультэта (пратакол № 10 ад 27 мая 1998 г.)

*Складальнікі:* І.А.Груца, В.Ц.Ісаеў, А.М.Космач, Н.Д.Ляўковіч, У.С.Пуцік, В.М.Фамін, В.Р.Федарасава, У.А.Ціток, Ф.А.Шумскі

*Пад рэдакцыяй* А.П.Жытко, У.В.Тугая, В.М.Фаміна

© Калектыў складальнікаў, 1998

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Тлумачальная запіска

У сувязі з тым, што ў вучэбныя планы гістарычных факультэтаў педагагічных універсітэтаў уведзены курс "Гісторыя славянскіх народаў", выкладчыкамі кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі падрыхтавана адпаведная праграма. Складаецца яна з дзвюх частак: "Гісторыі ўсходніх славян" і "Гісторыі заходніх і паўднёвых славян".

Славянскія народы – гэта своеасаблівы, шматгранны і рознабаковы сацыяльна-гістарычны феномен. Іх гісторыю нельга разглядаць паасобна. У той жа час славянскі свет цесна звязаны з заходнееўрапейскімі ды іншымі цывілізацыямі. Менавіта таму ў праграме прадугледжана асвятленне асноўных этапаў развіцця славянскіх народаў у кантэксце сусветнай гісторыі.

Складальнікі праграмы не прытрымліваліся вузкакласавага падыходу ў тлумачэнні гістарычнага мінулага: у праграме асвятляюцца розныя гістарыяграфічныя падыходы да разгляду ключавых пытанняў гісторыі славянскіх народаў. Пры гэтым яны кіраваліся такімі прынцыпамі гістарычнага пазнання, як аб'ектыўнасць, гістарызм і каштоўнасная значнасць.

Матэрыял праграмы размеркаваны паводле сучаснай перыядызацыі:

*першы перыяд* – сярэднявечча (V – канец XV – пачатак XVI ст.);

*другі* – новы час (XVI ст. – 1917 г.);

*трэці* – навейшы час (1917–1998 гг.).

Перыяды, у сваю чаргу, маюць ключавыя раздзелы.

Праграма прызначана студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў.

і сацыяльнай барацьбы ў Галіцыі. Пачатак рэвалюцыі 1905–1907 гг. у Каралеўстве Польскім.

Расстаноўка палітычных сіл на польскіх землях напярэдадні першай сусветнай вайны. Польскае пытанне ў першыя гады вайны. Акупацыя Каралеўства Польскага Германіяй і Аўстра-Венгрыяй.

Пазіцыі асноўных палітычных сіл. Польская эміграцыя. Лютаўская рэвалюцыя і польскае пытанне.

*Тэма 29. Духоўнае жыццё Польшчы*

Асноўныя рысы развіцця польскай культуры. Навука. М.Складоўская-Кюры. Адукацыя і школа. Кракаўскі універсітэт і Польская акадэмія ведаў. Кракаўская і Варшаўская гістарычныя школы. Важнейшыя кірункі ў гістарычнай навуцы.

Філасофская думка. Палітычная ідэалогія. Літаратура. Б.Прус, Э.Ажэшка, Г.Сянкевіч, С.Жаромскі, М.Канапніцкая.

Жывапіс. Музыка. Тэатр. Я.Мацейка, А.Герымскі, Г.Вяняўскі. Скульптура. Архітэктура.

*Тэма 30. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Сербіі 50–70-я гады XIX ст. – 1918 г.*

Развіццё прамысловасці, гандлю, сельскай гаспадаркі. Знешняя палітыка Сербіі пасля Берлінскага кангрэса. Утварэнне палітычных партый. "Асабісты рэжым" Абрановічаў. Дзяржаўны пераварот 1903 г. і яго вынікі. Баснійскі крызіс. Удзел Сербіі ў Балканскім саюзе і балканскіх войнах 1912–1913 гг.

Палітычнае развіццё Чарнагорыі. Рэформы князя Мікалая. Унутраная і знешняя палітыка Чарнагорыі на пачатку XX ст. Чарнагорыя ў час балканскіх войнаў.

Сацыяльна-эканамічныя працэсы і палітычнае развіццё Харватыі, Славакіі, Ваяводзіны. Змены ў аграрным ладзе. Развіццё прамысловасці. Палітычнае становішча Харватыі і Славеніі. Харватыя пасля харвата-венгерскага пагаднення 1868 г. Асноўныя палітычныя партыі і іх барацьба.

Вызваленчы рух на паўднёваславянскіх землях Аўстра-Венгрыі. Уздым нацыянальна-вызваленчага і сялянскага руху. Харвацка-Сербская кааліцыя. Утварэнне Харвацкай сялянскай партыі. Антун і Сцяпан Радзічы.



Македонія ў апошняй чвэрці XIX – пачатку XX ст. Нацыянальна-вызваленчы рух. Унутраная рэвалюцыйная арганізацыя. Ііндэйскае паўстанне 1903 г. Македонія ў 1903–1913 гг.

*Тэма 31. Асноўныя рысы духоўнага жыцця паўднёваславянскіх народаў*

Культура Сербіі і Чарнагорыі. Развіццё навукі ў Сербіі. Сербская акадэмія навук і мастацтва. Белградскі універсітэт. Ж.Жуёвіч, І.Цвіч. Філасофская думка. Палітычная ідэалогія. Панславізм М.Джурыча. Сербская літаратура. Б.Нушыч. Сербскае мастацтва. С.Макраняц.

Культура паўднёваславянскіх народаў Аўстра-Венгрыі. Адукацыя і навука. "Маціца Харвацкая" ў Загрэбе. "Маціца Сербская" ў Нові Садзе. Паўднёваславянская акадэмія навук і мастацтва. Й.Штрасмаер, Ф.Рачкі, Н.Тэсла. Заграбскі універсітэт. Харвацкая літаратура. А.Шэнаа. Славянская літаратура. А.Ашкерц, І.Цанкар. Мастацтва. Новасадскі ды іншыя народныя тэатры. Скульптура. І.Мяштровіч.

*Тэма 33. Паўднёваславянскія землі ў гады першай сусветнай вайны*

Забойства ў Сараеве. Пачатак першай сусветнай вайны. Балканскі фронт у 1914–1915 гг. Становішча ў паўднёваславянскіх землях у час вайны. Паўднёваславянскі камітэт. Корфская дэкларацыя. Палітычныя партыі паўднёваславянскіх земель у 1914–1917 гг. Уздым вызваленчага руху. Прарыў Салоніцкага фронту і ліквідацыя аўстра-венгерскай акупацыі.

## Навейшы час (1918–1998 гг.)

### *Раздзел 1.* Заходнія і паўднёвыя славяне ў міжваенны час (1918–1939 гг.)

*Тэма 1. Палітычнае развіццё і эканамічныя працэсы ў Чэхаславакіі ў міжваенны перыяд*

Утварэнне незалежнай рэспублікі. Рэформы 1918–1920 гг. Пасляваенны рэвалюцыйны рух. Унутраная і знешняя палітыка ўрада. Т.Масарык. Асноўныя палітычныя партыі і іх пазіцыі. (Чэшская нацыянальна-сацыяльная партыя, Чэшская народная партыя, Нацыянальная



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

партыя вальнадумцаў КПЧ). Эканамічныя працэсы. Увядзенне надзвычайных законаў. Узмацненне рэакцыі ў сярэдзіне 30-х гг.

Мюнхенскі дыктат. "Другая рэспубліка". Падзеі і акупацыя Чэхаславакіі. Пазіцыя заходніх дзяржаў і СССР.

***Тэма 2. Духоўнае жыццё Чэхаславакіі ў 1918–1939 гг.***

Адукацыя і навука. Асноўныя кірункі гістарычных даследаванняў.

Філасофская думка. Погляды Т.Масарыка. Палітычная ідэалогія.

Літаратура. С.Нейман, І.Волькер, К.Чалек, І.Ольбрахт, М.Маерава, М.Пуйманава. Тэатр. Кінематаграфія. Музыка. Выяўленчае мастацтва.

***Тэма 3. Палітычнае развіццё і сацыяльна-эканамічныя працэсы ў Польшчы ў 1918–1925 гг.***

Утварэнне Польскай дзяржавы. Перадумовы адраджэння незалежнай Польшчы. Аднаўленне незалежнасці Польшчы. Пазіцыі асноўных палітычных партый. Рашэнні Парыжскай мірнай канферэнцыі па польскім пытанні. Польска-савецкая вайна 1920 г.

Рыжскі мір. Плебісцыт у Вармії, Мазурах і Верхняй Сілезіі. Польскія землі ў складзе Германіі. Канстытуцыя 1921 г. Эканамічнае і палітычнае становішча ў краіне ў 1921–1923 гг. Знешняя палітыка Польшчы. Рэвалюцыйны ўздым у 1923 г. Роля Камінтэрна ў палітычных падзеях у Польшчы. Эканамічнае і палітычнае становішча ў 1924–1925 гг.

***Тэма 4. Дзяржаўны пераварот 1926 г. і яго вынікі***

Пазіцыі асноўных палітычных партый. Рэжым санацыі. Ю.Пілсудскі. Канстытуцыя 1935 г. Унутраная і знешняя палітыка Польшчы напярэдадні другой сусветнай вайны.

Савецка-германскі пакт аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г. Фашысцкая агрэсія супраць Польшчы. Пачатак другой сусветнай вайны.

***Тэма 5. Духоўнае жыццё Польшчы ў міжваенны перыяд***

Адукацыя і навука. Універсітэты. Акадэмія ведаў у Кракаве. Гістарыяграфія. Філасофская думка. Палітычная ідэалогія.



Літаратура. С.Жаромскі, З.Налкоўская, Ю.Тувім, Б.Бранеўскі. Тэатр. Музыка. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура і скульптура. Д.Дунікоўскі.

***Тэма 6. Палітычнае і эканамічнае развіццё Югаславіі (1918–1941 гг.)***

Утварэнне каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (СХС). Унутранае становішча аб'яднаных дзяржаў. Аграрная рэформа. Палітычны крызіс канца 1920 г. "Абзнана". Відаўданская канстытуцыя. Знешняя палітыка каралеўства СХС. Эканамічнае развіццё. Нацыянальнае пытанне. Харвацкая рэспубліканская сялянская партыя.

Дзяржаўны пераварот 1929 г. Канстытуцыя 1931 г. Узмацненне эканамічнай залежнасці краіны ад Германіі. Палітыка ўрада Стаядзіновіча. Становішча ў Югаславіі напярэдадні і на пачатку другой сусветнай вайны. Падзеі 27 сакавіка 1941 г. Крах рэжыму манархіцкай дыктатуры.

***Тэма 7. Духоўнае жыццё краіны***

Адукацыя і навука ва ўмовах аб'яднанай дзяржавы. Люблянскі універсітэт і Славянская акадэмія навук.

Філасофская думка. Палітычная ідэалогія. Канцэпцыя "інтэгральнага паўднёваславянства". Манархічныя, фашысцкія ідэі.

***Тэма 8. Палітычныя працэсы і эканамічнае развіццё Балгарыі (1918–1941 гг.)***

Рэвалюцыйны ўздым у 1918–1919 гг. Знешняя і ўнутраная палітыка кааліцыйнага ўрада А.Стамбалійскага. Рэформы ўрада БЗНС і яго знешняя палітыка. Чэрвеньскі пераварот 1923 г. Пачатак фашызацыі краіны. Верасаўскае паўстанне 1923 г.

Палітычнае развіццё краіны ў 1924–1925 гг. Расстаноўка палітычных сіл. Урад А.Ляпчава (1926–1931 гг.). Урад "Народнага блока". Пераварот 1934 г. і ўсталяванне ваенна-фашысцкай дыктатуры. Унутраная і знешняя палітыка фашысцкага ўрада. Барацьба за стварэнне антыфашысцкага народнага фронту. Балгарыя на пачатку другой сусветнай вайны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ